Горянина Я.Ю., студ. 416 гр. ФМИ
БГУ культуры и искусств
Научный руководитель – Мангушев И.А., доцент

**ПРАБЛЕМЫ ФУНКЦЫЯНАВАННЯ ДЗІЦЯЧЫХ ФАЛЬКЛОРНЫХ КАЛЕКТЫВАЎ НА СУЧАСНЫМ ЭТАПЕ МУЗЫЧНАЙ КУЛЬТУРЫ (на прыкладзе работы фальклорнага ансамбля “*Дударык*і” нацыянальнай гімназіі № 14 г. Мінска)**

**Актуальнасць даследвання.** Сучаснае становішча музычнай культуры Беларусі характарызуецца звяртаннем да нацыянальнай спадчыны беларусаў, вяртаннем у музычна-інструментальную творчасць тых музычных інструментаў, якія лічыліся ўвогуле зніклымі. Сёння можна адзначыць, што працэс адраджэнне беларускай народнай мастацкай спадчыны ўключае два кірунка:

1) адраджэнне народных рамёслаў, музыкі, песень, танцаў, абрадавых традыцый з улікам вывучэння і папулярызацыі беларускага песеннага і танцавальнага фальклора;

2) адраджэнне такіх старажытных традыцыйных народных музычных інструментаў, як скрыпкі, гармонікі, дудкі, жалейкі, акарыны, саломкі, ліры, дуды, цытры і іншыя.

Усё гэта спрыяя ўмацаванню і далейшаму развіццю музычных традыцый беларусаў і станоўча ўплывае на плённую творчую дзейнасць шматлікіх фальклорных калектываў. Гэта абумовіла выбар **аб’ект даследвання** – вывучэнне тэндэнцый развіцця музычнага фальклору, і **прадмэт даследвання** – праблемы функцыянавання дзіцячых фальклорных калектываў на сучасным этапе развіцця музычнай культуры Беларусі. Звернемся да **асноўных вынікаў даследвання**.

Каб высвятліць асновные аспекты праблем функцыянавання дзіцячых фальклорных калектываў на сучасным этапе музычнай культуры Беларусі, мы звярнуліся да вывучэння **спецыяльнай літаратуры**. Асобную зацікаўленнасць прадставіла работа В.Антаневіч аб асаблівасцях народнага выканальніцкага мастацтва [1, с. 68 – 71] і работа В.Трамбіцкай аб

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

праблемах працэсу фарміравання рэпертуару ў дзіцячых народна-інструментальных мастацкіх калектывах фальклорнага кірунку [18, с. 35 – 37]. Трэба адзначыць тое, што ў апошні час назіраецца ўзвышаная зацікаўленнасць да вывучэння, напрыклад, традыцыйных народных духавых і ударных музычных інструментаў. Важная роля ў працэсе папулярызацыі ведаў аб гэтых унікальных рарытэтах нацыянальнага мастацтва Беларусі належыць навуковым і навукова-папулярным публікацыям спецыялістаў у галіне народнай творчасці і музычнага мастацтва. Працы гэтых аўтараў прысвечаны аналізу беларускай інструментальнай музыцы [4; 5; 8], традыцыйным народным духавым і ударным музычных інструментам беларусаў [9 – 17]. Трэба адзначыць то, што, напрыклад, украінцы актыўна папулярызуюць такі нацыянальны музычны інструмент, як сапілка не толькі ў сваей краіне, але і па-за яе межамі ў суполках суайчыннікаў [6; 7].

У працэсе вывучэння праблемы функцыянавання дзіцячых фальклорных калектываў на сучасным этапе музычнай культуры Беларусі мы звярнуліся да работы такога вядучага дзіцячага мастацкага калектыву, як фальклорны ансамбля “***Дударыкі***” мінскай нацыянальнай гімназіі № 14. Гэты легендарны калектыў быў заснаваны ў 1970-1971 навучальным годзе. Творчая дзейнасць калектыва пачыналась з 20 хлапчукоў, якія ігралі на дудках беларускую народную музыку. Сёння у рэпертуарнай палітры ансамбля – разнастайныя народныя песні, танцы, найгрышы на старадаўніх інструментах. Сёння тут у асноўным саставе займаецца 24 дзяучынкі і 8 хлапчукоў, а ў складзе дублёраў – 30 дзяцей, у падрыхтоучай групе – 20. Усе яны – навучэнцы гімназіі № 14, выдатнікі вучобы. У калектыве “***Дударыкі***” ёсць і так званыя «сямейныя дынастыі», і юныя таленты, якім толькі па 6 гадоў. Амаль усе ўдзельнікі калектыва граюць на розных беларускіх музычных інструментах: жалейке, цымбалах, дудцы, акарыне, гармоніке, скрыпцы, дудзе, ліры. З 1993 года калектыў ансамбля актыўна займаецца дабрачыннай дзейнасцю ў горадзе і рэспубліцы. З гастрольных паездак у далёкая замежжа ансамбль прывозіу ганаровыя дыпломы. Гэты калектыў –

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

лаўрэат шматлікіх конкурсаў, пастаянны ўдзельнік тэле- і радыёперадач аб беларускай народнай песеннай культуры. Вывучэнне і прапаганда беларускай нацыянальнай духоунай спадчыны, у тм ліку і народнай творчасці і музычнагша мастацтва, – гэта прыарытэтны кірунак выхаваучай дзейнасці ў нацыянальнай гімназіі № 14. Менавіта ў гэтаў навучальнай установе была створана аўтарская выхаваўчая праграма “Спадчына”, ў аснову якой пакладзена адказная задача па вывучэнню беларускай нацыянальнай духоўнай культуры беларусаў.

У выніку шматгадовай пошукавай дзейнасці па ініцыятыве ўдзельнікаў ансамбля “Дударыкі” пераабсталяваны музычны клас пад музей у стыле звычайнай сялянскай хаты з цаглянай печчу, люлькай, калаўротамі, ручнікамі, абрусамі, пляцёнкамі цыбулі, бажніцай. Гэтая дзейнасць – пачатак музейнай работы, узор для пераймання вопыту іншым школам нашай сталіцы. Экспазіцыі музея маюць своеасаблівае выхаваўчае значэнне: былы сялянскі побыт у значнай меры пашырае кругагляд гарадской дзетвары, дае больш яскравае ўяўленне аб асяродзі, ў якім нараджаліся бясцэнныя скарбы народнай творчасці, дапамагае юным выканаўцам адчуць першародную яе прыгажосць і чысціню. Як сапраўдныя музычныя інструменты, гучаць у канцэртах “Дударыкаў” пілы, косы, набілкі, маслабойкі, калайрот, чыгуны, падковы, якія з’яоляюцца экспанатамі музея. Менавіта тут праходзяць урокі мастацкай культуры, літаратуры, ладзяцца народныя святы. Працягам работы калектыва па папулярызацыі дасягненняй народна-інструментальнай спадчыны стала стварэнне экспазіцый выставачнай залы музычных інструментаў. Экспазіцыя адкрыта ў маі 2003 года, ў фондах такога музея – больш за 300 экспанатаў, адных гармонікаў – больш за сто, тут таксама ёсць дыятанічныя цымбалы, рэдкія музычныя інструменты – ліра, цытра, дуда, старажытная труба, саломкі, акарыны, усяго – 64 назвы. Кожны інструмент – гэта аўтарская работа беларускіх музычных майстроў: М.Судніка, Ф.Жукоўскага, М.Гайдукевіча, А.Красава, И.Лычкоўскага, М.Астрэйкі, І.Еўдакімава, В.Кульпіна, Д.Ровенскага.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

“Дударыкі” сёння – гэта самастойны калектыў, які мае свой стыль, свой твар, сваю задачу і мэту. Падпарадкоўваючы грамаду гледачоў духоўнаму імкненню да паразумення беларусскай песні, калектыў даносіць да слухача лепшыя фальклоныя творы беларусаў.

Ансамбль “***Дударык***і” – гэта прыклад скарбонкі беларусаў, духоунасці, беларускага народа, прыклад вялікай самаадданасці беларускай народнай культуры і служэння на карысць нашай Радзімы.

У нацыянальнай гімназіі № 14 Д.Д.Ровенскі пачаў працават настаунікам музыкі і спеваў з 1970 года, а потым – кіраўніком духавога аркестра. Ў 1975 годзе ён скончыў вячэрняе аддзяленне музычнага вучылішча імя Глінкі, а ў 1985 годззе – дырыжорскі факультэт інстытута культуры. Д.Д.Ровенскі – таленавіты музыка, знаўца і апантанны прыхільнік папулярызацыі беларускай народнай культуры і мастацтва. Сэнс яго працы – далучэнне маладога пакалення да крыніц народнай культуры. Многія ўдзельнікі ансамбля ўжо сталі прафесійнымі музыкантамі. За творчую плёную дзейнасць, а таксама за асабісты уклад у захаванне і развіцце беларускіх нацыянальных традыцый, Д,Д.Ровенскі ў 1999 годзе атрымаў ганаровае званне “Заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь”, а ў 2006 – “Выдатнік адукацыі”.

**Такім чынам,** на прыкладзе работы фальклорнага ансамбля “***Дударыкі***” нацыянальнай гімназіі № 14 г.Мінска можна пераканацца ў тым, што працэс развіцця народных музычна-інструментальных традыцый беларусаў плённа працягваецца. На наш погляд, неабходна больш актыўна ажыццяўляць працэс папулярызацыі творчай дзейнасці фальклорных калектываў пры дапамозе розных сродкаў інфармацыі: часопісы, тэле- і радыёперадачы, афішы, буклеты і інш. Фальклорныя калектывы абавязкова павінны весці актыўную канцэртную дзейнасць і ў вёсках, і ў вялікіх і малых гарадах, ва ўсёй рэспубліцы, а таксама і па-за яе межамі.

Список использованной литературы:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. Антоневич В.А. Народное исполнительское искусство как один из источников обогащения профессионального творчества на современном этапе // Вопросы культуры и искусства Белоруссии: Респ. межвед. сб. – Мн.: Вышэйш. шк., 1982. – Вып. 1. – С. 68–71.
2. Аўтэнтычны фальклор: праблемы вывучэння, захавання, пераймання: зборнік навуковых прац удзельнікаў III Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі (Мінск, 29-30 красавіка 2009 г.). – Мінск, БДУКМ, 2009. – 187 с.
3. Аўтэнтычны фальклор: праблемы вывучэння, захавання, пераймання: зборнік навуковых прац удзельнікаў IV Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі. – Мінск, БДУКМ, 2010. –167 с.
4. Беларуская народная інструментальная музыка / Фоназапісы, натацыя / Рэд. і сістэматызацыя найгрышаў, уступ. арт. і навук. камент. І.Д.Назінай. – Мн.: Навука і тэхніка, 1989. – 655 с. – (Бел. нар. творчасць / АН БССР. Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору.)
5. Белорусские народные наигрыши / Сост. и авт.вступ.ст. И.Д.Назина; Под общ. ред. В.Петрова. – М.: Музыка, 1986. – 12с.
6. Божок І. Урокі гри на сопілці. Урок І. // Рідні джэрэла. Науково-методичний часопис для вчителів української діаспори. – 1998. - № 1 – 2. – С. 42-44.
7. Божок І. Недільна школа сопілкаря // Рідні джэрэла. Науково-методичний часопис для вчителів української діаспори. – 1998. - № 3. – С. 43-47.
8. Благовещенский И.П. К истории белорусской народной инструментальной музыки // Благовещенский И.П. Некоторые вопросы музыкального искусства (педагогика, эстетика, фольклор). – Мн., 1965. – С. 103–143.
9. Бярбераў У. Дудка беларуская // Культура. – 1992. – люты (№ 5). – С. 3.
10. Бярбераў У. Жалейка // Культура. – 1992. – люты (№ 6). – С. 8.
11. Бярбераў У. Іду да дудароў // Культура. – 1992. – люты (№ 7). – С. 7.
12. Гром У.М. Дуда ў фальклорна-інструментальнай творчасці беларусаў // “Этнашкола» ў сучасным адукацыйным працэсе: вопыт станаўлення і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

перспектывы развіцця (да 10-годдзя існавання) / Уклад. I навук. рэдакт. праф. І.І.Сучкоў. – Мн.: Бестпринт, 2004. – С- 81 - 86.

**13.** Коротеев А.Л Фольклорные духовые инструменты белорусов в этнокультурном воспитании и художественном образовании детей и молодёжи (от музыкальной игрушки до разнообразия национального инструментария). // "Этнашкола» ў сучасным адукацыйным працэсе: вопыт станаўлення і перспектывы развіцця (да 10-годдзя існавання) / Уклад. I навук. рэдакт. праф. І.І.Сучкоў. – Мн.: Бестпринт, 2004. – С- 87-94.

**14.** Коротеев А.Л. Функциональные и этноорганологические особенности белорусских народных духовых инструментов // X Міжнародныя Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні, прысвечаныя Дням славянскага пісьменства і культуры (Мінск, 24-26 мая 2004 г.) / Рэдкал.: М.А.Бяспалая (адк. Рэд.) і інш. – Мн.: Бел. дзярж. Ун-т культуры і мастацтваў, 2005. – С. 66-72.

**15.** Короткевич А.О. Народные духовые инструменты белорусов как компонент художественной культуры //Научные труды Республиканского института высшей школы. Философские, гуманитарные науки. – Ред.кол.: М.И.Демчук [и др.]. – Минск: РИВШ 2006. – С. 162-168.

**16.** Карацееў А.Л. Народны духавы музычны інструментарый Беларусі як гістарычная сведка развіцця нацыянальнай культуры і яго месца ў сусветнай арганалогіі і арганафоніі // Зборнік тэзісаў дакладау на навукова-метадычнай канферэнцыі прафесарска- выкладчыцкага складу, ч. 1. - Мн.: МІК. 1993. - С. 21-26.

**17.** Назіна І.Д. Беларускія народныя музычныя інструменты. – Мн.: Беларусь, 1997. – 239 с.

**18.** Трамбицкая, В.И. Формирование репертуара детских народно-инструментальных коллективов фольклорного направления / В.И.Трамбицкая // Вопросы теории и практики КПР: тезисы докладов на конференции профессорско-преподавательского состава (ХП). – Мн.: МИК, 1991. – С. 35-37.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ